

Рэгіёны да сяўбы гатовы

СТАР. 2



Цярністы шлях да святасці

СТАР. 3



«Інтэграл»: 55 гадоў у касмічным старце

СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 КРАСАВІКА 2018 г. СУБОТА № 67 (28683)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПУЛЬС СНД

**Учора ў Мінску адбылося чарговае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Па словах Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, тое, што яно праходзіць менавіта ў беларускай сталіцы, — знак павагі да Беларусі і прызнання яе актыўнай праінтэграцыйнай пазіцыі.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што зараз найбольш небяспечная тэндэнцыя на еўраатлантычнай прасторы — расхістванне сістэмы процівага, якія раней стрымлівалі дзяржавы і блокі, што сапернічалі. «Знаходзячыся ў своеасаблівым геапалітычным разломе, Беларусь асэнсоўвае недасканаласць раскручвання спіралі канфрантацыі ў Еўрапейскім рэгіёне. Мы фактычна на парозе новай гонкі ўзбраенняў. Эксперты сцвярджаюць, што халодная вайна ўжо ідзе», — кажа Прэзідэнт.

Толькі цяпер вырашаць праблемныя пытанні светаўладкавання даводзіцца не за сталом перагавораў, а ў гарачых кропках. І найбліжэйшая з іх да нас — Данбас. Дзякуючы Мінскім пагадненням там спынены шырокамаштабныя баявыя дзеянні, але людзі, на жаль, працягваюць гінуць. «Яшчэ раз пацвярджаю: мы гатовы зрабіць усё, каб на Данбасе быў мір. На прынцыпах выканання ўсіх міжнародна-прававых фармальнасцяў і пры згодзе канфліктуючых бакоў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар нагадаў, што падчас 26-й сесіі ПА АБСЕ Беларусь прапанавала распачаць дыскусію аб пачатку перагаворнага працэсу для пераадолення існуючых супярэчнасцяў і стварэння новых канструктыўных адносін у рэгіёне АБСЕ. «Варта выпрацаваць прымальныя для ўсіх прынцыпы супрацоўніцтва ў Еўропе», — лічыць ён. У гэтым значную ролю можа адыграць экспертны дыялог. Напрыклад, у маі ў Мінску адбудзецца міжнародная канферэнцыя аб бяспецы ва Усходняй Еўропе. Сёлета пройдзе і антытэрарыстычная канферэнцыя АБСЕ, і сустрэча Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на палітычныя кампаніі ў асобных краінах СНД. Ён павіншаваў Расію з годна праведзенымі прэзідэнцкімі выбарамі і дадаў, што Беларусь разлічвае на захаванне лідзіруючай пазіцыі Расіі ў дзейнасці Садружнасці. Праз лічаныя дні выбары прэзідэнта адбудуцца і ў Азербайджане. «Я перакананы, што азербайджанскі народ, як і расійскі, зробіць правільны выбар на карысць умацавання і росквіту сваёй дзяржавы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У гэтым годзе ў СНД старшынствуе Таджыкістан, і Беларусь чакае ад яго плённых ініцыятыў, дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што зараз асаблівую ролю адыгрываюць місіі назіральнікаў ад СНД, у той час як іх еўрапейскія калегі працуюць палітызавана. А назіранне ад Садружнасці дае магчымасць сфарміраваць альтэрнатыўнае меркаванне.

СТАР. 2

# СВЯТА, НАПОЎНЕНАЕ ЛЮБОЎЮ

*Праваслаўным хрысціянам Беларусі*

**Дарагія суайчыннікі!**

Шчыра віншую вас са светлым Хрыстовым Уваскрэсеннем!

Святы Вялікдзень сімвалізуе перамогу жыцця і аб'ядноўвае людзей, для якіх маральнымі арыенцірамі з'яўляюцца дабрыня і міласэрнасць.

Гэтае свята раскрывае сутнасць хрысціянства, напоўненага святлом і любоўю, і знамянуе сабой духоўнае абнаўленне кожнага чалавека, які адкрыў сваё сэрца для веры.

Асаблівая атмасфера гэтых дзён дорыць прыхаджанам глыбокую, непадробную радасць, умацоўвае імкненне рабіць добрыя справы, акружаць клопатам родных, блізкіх і тых, хто мае патрэбу ў спагадзе і падтрымцы.

Няхай Вялікдзень прынясе ў вашы дамы і сем'і спакой, дабрабыт і вясенні настрой.

Жадаю вам шчасця, моцнага здароўя і ўзаемаразумення.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Велікоднае пасланне мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам і ўсім верным дзецям Беларускай Праваслаўнай Царквы

*Нябёсы дастойна няхай весяляцца,*
*і зямля няхай радуецца,*
*і няхай святкуе ўвесь свет, бачны і нябачны,*
*бо паўстаў Хрыстос — радасць вечная.*

*Трапар 1-й песні Пасхальнага канона*

Дарагія і ўзлюбленыя ў Госпадзе сабраты архіпастыры, высокашаноўныя прасвітары і дыяканы, богалюбівыя інакі і інакіні і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

З Пасхальным лікаваннем, якое перапаўняе сэрца, і светлай радасцю аб Уваскрэслым Госпадзе нашым Іісусе Хрысце вітаю вас у гэты вялікі і светаспасіцельны дзень. У словах гэтага дзівоснага воклічу — аснова жыцця, якое перамагло смерць і тленне, дар надзеі і любові, крыніца нашай веры.

Уваскрэсенне Хрыстова — гэта трыумф любові Бога да Свайго стварэння — чалавека, трыумф Божай любові да кожнага з нас, любові, якая вызваліла нас ад улады дыявала. Апостал Іаан Багаслоў, пацвярджаючы гэтую думку, сведчыць, што «не



мы ўзлюбілі Бога, а Ён узлюбіў нас і паслаў Сына Свайго як уміласціўленне за грахі нашы» (1 Ін. 4:10), Сына Божага, Які пакутаваў дзеля нас і нашага спасення.

СТАР. 3

# СМУТКУЕМ РАЗАМ

**Прэзідэнт выказаў спачуванні ў сувязі з трагедыяй на шахце ў Грузіі.**

Ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні Прэзідэнту Грузіі Гіоргію Маргвелашвілі і сем'ям тых людзей, якія трагічна загінулі на шахце «Міндэлі» ў выніку абрушэння зводу, а таксама пажадаў хутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Па папярэдняй інфармацыі, 5 красавіка ў тунэлі шахты адбылася дэфармацыя адной са сцен, з-за чаго абрынулася столь. Як адзначана ў заяве міністэрства ўнутраных спраў Грузіі, загінулі шэсць рабочых і трое атрымалі цялесныя пашкоджанні.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ Сацыяльная ініцыятыва

# НЕРАЎНАДУШНЫЯ БЕЛАРУСЫ І ІХ ІДЭІ

## Падарожнічаць, быць элегантнымі ў любым узросце, правільна харчавацца і жыць доўга...

**Апошнім часам у нашай краіне з'яўляюцца ўсё новыя і новыя сацыяльныя праекты. Іх збіраюцца запускаць і асобныя супольнасці, і дзяржаўныя сацыяльныя службы, і проста энтузіясты. З'явілася такое пачынанне, як Social Weekend, калі бізнес праводзіць конкурс сацыяльных праектаў і падтрымлівае найбольш цікавыя з іх. Прасочваецца добрая тэндэнцыя: сярод неабыякавых да сацыяльных праблем людзей усё больш моладзі. Ідэі ў людзей — самыя разнастайныя. Сёння мы пазнаёмім вас з некаторымі ініцыятывамі.**

### «Карысныя падарожжы»

У Гомелі ўжо ёсць клуб пазітыўных падарожжаў — гэта адкрыты лекторый, дзе некалькі разоў на месяц праводзяцца сустрэчы з цікавымі людзьмі, якія шмат вандруюць і гатовыя падзяліцца з усімі сваімі гісторыямі, уражаннямі і карыснымі парадамі. Нядаўна, напрыклад, Мурат Турашоў тут расказваў аб Гімалаях, а Васіль Цітоў — пра тое, як з'ездзіў у Эфіопію. Неўзабаве будзе аповед пра Іран... Прыходзяць паслухаць падарожнікаў самыя розныя людзі — не толькі моладзь, але і маладыя мамы з маленькімі дзецьмі, і пенсіянеры. Многія «загараюцца»: я таксама хачу!

— Шмат людзей баяцца падарожнічаць, але ж гэта так выдатна! І каб зняць гэты страх, можна пачаць з невялікіх вандровак па Беларусі, — кажа 26-гадовая гамяльчанка **Аляксандра САЛАЎЁВА**, якая зараз навучаецца ў школе «Сацыяльны прадпрымальнік». — Таму ў мяне нарадзілася ідэя новага праекта — «Карысныя падарожжы». Сутнасць ідэі — у падарожжах па Беларусі з экалагічным ухілам (падарожнічаючы, можна сабраць смецце на нейкім участку ці пасадзіць дрэвы, зімой можна вешаць шпакоўні і яшчэ можна рабіць шмат чаго карыснага для прыроды). Хацелася б зрабіць свет больш чыстым...

СТАР. 8

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У ГЕРМАНІІ СУД ВЫПУСЦІЎ ПУЧДЭМОНА З-ПАД ВАРТЫ ПАД ПАДПІСКУ АБ НЯВЫЕЗДЗЕ

**Лідар каталонскіх сепаратыстаў Карлес Пучдэмон выпушчаны з-пад варты ў Германіі пад падпіску аб нявыездзе. Вярхоўны зямельны суд Шлезвіг-Гольштэйна ў чацвер прыняў рашэнне экстрадзіраваць каталонскага палітыка. Разам з тым яго выпусцілі на волю пад падпіску аб нявыездзе і пад заклад у 75 000 еўра.**

Рашэнне аб экстрадыцыі грунтуецца на абвінавачанні Іспаніяй Пучдэмона ў растраце дзяржаўных сродкаў, але не на абвінавачанні ў арганізацыі бунту. Аднак канчатковае рашэнне пра лёс каталонскага палітыка будзе прымаць Генеральная пракуратура ФРГ.

55-гадовы Карлес Пучдэмон у кастрычніку 2017 года абвясціў незалежнасць Каталоніі ад Іспаніі і затым збег у Бельгію, ратуючыся ад пераследу з боку іспанскай юстыцыі. 25 сакавіка ён быў затрыманы ў Германіі, праз тэрыторыю якой ён праязджаў, вяртаючыся з Фінляндыі ў Бельгію.

## ЭКС-ПРЭЗІДЭНТ ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ ПАК КЫН ХЭ ПРЫСУДЖАНА ДА 24 ГАДОЎ ТУРМЫ

**Былы прэзідэнт Рэспублікі Карэя Пак Кын Хэ прысуджана да 24 гадоў турэмнага зняволення і штрафу ў $17,5 млн. Пра гэта гаворыцца ў абвешчаным прысудзе.**

ISSN 1990 - 763X

Суд прызнаў экс-прэзідэнта вінаватай па 16 з 18 прад'яўленых пракуратурай абвінавачанняў, у тым ліку ў выдаванні дзяржаўнай тайны, вымаганні і атрыманні хабару, а таксама ва злоўжыванні ўладай.

Абвяшчэнне прысуду ўпершыню ў гісторыі краіны прайшло ў прамым тэлевізійным эфіры, нягледзячы на пратэсты абароны. Сама Пак Кын Хэ адмовілася прысутнічаць на фінальным пасяджэнні суда. У яе адвакатаў ёсць права на працягу тыдня падаць апеляцыю ў суд вышэйшай інстанцыі.

Паўднёвакарэйскія эксперты адзначаюць, што практычна ўсе абвінавачанні супраць Пак Кын Хэ будуюцца выключна на паказаннях яе былога асабістага сакратара Ан Чжон Бома і сведчаннях шэрагу іншых людзей. Рэальныя рэчавыя доказы існуюць толькі па некалькіх эпізодах, у прыватнасці, у дачыненні да чорнага спіса апазіцыйных дзеячаў культуры і мастацтва, якім было адмоўлена ў дзяржаўнай падтрымцы.

## ПРЭЗІДЭНТ МЕКСІКІ ЗАКЛІКАЎ ТРАМПА НЕ ЗРЫВАЦЦА НА ЯГО НАРОДЗЕ З-ЗА ЎНУТРАНЫХ ПРАБЛЕМ ЗША

Прэзідэнт Мексікі Энрыке Пенья Ньета заклікаў свайго калегу Дональда Трампа не зрываць на мексіканцах сваё раздражненне з-за праблем ва ўнутранай палітыцы. Так лідар лацінаамерыканскай краіны ў апублікаваным відэазвароце адрэагаваў на рашэнне кіраўніка суседняй краіны размясціць падраздзяленні Нацыянальнай гвардыі на агульнай мяжы.

«Калі вашы нядаўнія заявы выкліканы непакоем, звязаным з пытаннямі ўнутранай палітыкі, з вашымі законамі або Кангрэсам, то займіцеся імі, а не мексіканцамі, — сказаў Пенья Ньета, звяртаючыся да Трампа. — Мы не дазволім, каб негатыўная рыторыка вызначала нашы дзеянні». Ён падкрэсліў, што Мексіка гатова прыйсці да пагадненняў з ЗША і весці дыялог «сур'ёзна, добрасумленна і канструктыўна».

Трамп падпісаў распараджэнне аб прыцягненні часцей Нацгвардыі да аховы мяжы ЗША з Мексікай, каб «спыніць паток наркотыкаў, іншых кантрабандных тавараў, членаў бандыцкіх груповак, іншых злачынцаў, а таксама нелегальных імігрантаў».

## КОРАТКА

**РУП «Белпошта» апублікавала рэжым работы аддзела паштовай сувязі 7 і 8 красавіка. 7 красавіка будуць працаваць усе аддзяленні паштовай сувязі па ўстаноўленым рэжыме, а на Вялікдзень будуць працаваць толькі дзяжурныя аддзяленні.**

Тэмпературны рэкорд зафіксаваны 5 красавіка ў Брэсцкай вобласці. У Пінску паветра прагрэлася да 21,7 градуса. Ранейшы рэкорд — плюс 21,2 градуса — быў зафіксаваны 5 красавіка 1946 года. Столькі ж градусаў цяпла паказалі тэрмометры на станцыі «Палеская» ў Лунінецкім раёне (у 2009 годзе — 20,8 градуса вышэй за нуль). У Баранавічах слупок тэрмометра падняўся да 20,5 градуса (у 2009 годзе — 20,4 градуса).

**У Магілёўскай вобласці ўзровень вады ў Друці (у раёне вёскі Гарадзішча) і Проні (каля вёскі Ляцягі) упершыню за пяць гадоў перавысіў высокія небяспечныя адзнакі.**

## Святлана САХАНЕНКА:

# «БУДУ РАДА, КАЛІ МАЯ ГІСТОРЫЯ СТАНЕ ДЛЯ КАГОСЬЦІ ПРЫКЛАДАМ»

## Трохразовая параалімпійская чэмпіёнка расказвае пра пераадольванне цяжкасцяў, як жыве са зрокам мінус 12 і ці лічыць сябе чалавекам з абмежаванымі магчымасцямі

**Святлана Саханенка нарадзілася ў Наваполацку ў шматдзетнай сям'і, няпростае дзяцінства пакінула шмат успамінаў у яе памяці. У нейкі момант, каб зрабіць яго больш шчаслівым, Света, выдатніца ў школе, запісалася ў спартыўную секцыю, а калі пачала дамагацца сваіх першых поспехаў у лыжных гонках, урачы забаранілі ёй выступаць. У дзяўчынкі імкліва пагаршаўся зрок. Каб перабудаваць сваё жыццё са спартыўнага ў звычайнае, патрабавалася нямала намаганняў. Святлана шукала сябе на працягу 6—7 гадоў, за якія паспела папрацаваць афіцыянткай, менеджарам, адміністратарам, дырэктарам і прыбіральшчыцай. А потым лёс вярнуў яе ў спорт, праз год пасля таго, як Саханенка аднавіла заняткі лыжнымі гонкамі, яна тройчы заваявала «золата» Параалімпійскіх гульняў.**





***— З моманту вашых перамог прайшло ўжо практычна тры тыдні, якія адчуванні зараз?***

— Разгубленасць, бо не ведаю, што рабіць далей. Быццам бы ўсё ёсць, пік ужо прайшоў, а як ставіць чарговыя мэты? Але гэта справа часу, усё напрацоўваецца і вельмі хутка, проста трэба трохі адпачыць.

Паверыла і ўсвядоміла, што я здзейсніла подзвіг, дасягнула такога вяліка поспеху, толькі ў нашым аэрапорце. Эмоцыі, якія былі там, у Карэі, пасля гонак і тут, у Мінску, зусім розныя. Калі ты непасрэдна на месцы спаборніцтваў, то разумееш, што перамога — гэта плён тваёй працы, а калі прыязджаеш дадому, людзі пачынаюць віншаваць, захапляцца і ты пачынаеш разумець, што здабыў гэтую перамогу не толькі для сябе, але і для краіны.

СТАР. 12

# Кітай падстаўляе плячо

**Учора было падпісана чарговае пагадненне аб забеспячэнні Кітаем бязвыплатнай ваеннай дапамогі Беларусі. Гэта стала часткай афіцыйнага візіту ў нашу краіну міністра абароны Кітайскай Народнай Рэспублікі генерал-палкоўніка Вэй Фэнхэ, у межах якога адбылася і яго сустрэча з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам.**

«Я хачу падзякаваць у вашай асобе кіраўніцтву Кітайскай Народнай Рэспублікі за тую неацэнную эканамічную, фінансавую падтрымку, якую вы аказваеце Беларусі. Асаблівая падзяка за тое ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва, якое склалася паміж нашымі краінамі. У наш час вы адыгралі вырашальную ролю ва ўмацаванні абараназдольнасці Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар адзначыў, што Кітай дапамог нашай краіне ў стварэнні сучасных касмічных падраздзяленняў. Такім чынам быў адпраўлены на арбіту спадарожнік, сканструяваны па найноўшых тэхналогіях, а таксама створаны цэнтр кіравання палётамі. КНР пасадзейнічала і ў тым, каб у беларускай арміі з'явілася сучаснае ракетнае ўзбраенне. «На аснове гэтага мы стварылі больш сучасныя ўзоры ракетнага ўзбраення, якія зацікавяць ужо і вашу армію. Я ўдзячны вам за тую бязвыплатную дапамогу, якую вы аказваеце нашай арміі», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што Кітай падставіў нам плячо ў складаны час, калі Захад увёў санкцыі супраць Беларусі. «Мы гэта памятаць будзем доўга. У вас тут ёсць надзейныя сябры», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Кітай з паспяховым завяршэннем палітычных кампаній, што пацвердзіла стабільнасць у палітычнай і сацыяльнай сферах краіны. Аляксандр Лукашэнка папрасіў яшчэ раз — ужо асабіста — перадаць віншаванні і найлепшыя пажаданні кіраўніку Кітая Сі Цзіньпіну.

У сваю чаргу міністр абароны Кітая перадаў вітальныя словы беларускаму лідару ад Сі Цзіньпіна. Ён падкрэсліў, што нашы краіны — добрыя сябры, партнёры і, можна сказаць, браты.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ПУЛЬС СНД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асобна была закранута тэма барацьбы з міжнародным тэрарызмам і экстрэмізмам. Беларусь сёлета плануе правесці мерапрыемства, накіраванае на паглыбленне каардынацыі паміж СНД і іншымі міжнароднымі структурамі па пытаннях супрацьдзеяння пападанню зброі масавага знішчэння ў рукі тэрарыстаў. Таксама варта забяспечыць актыўную работу паміж сілавымі ведамствамі.

Падчас сустрэчы кіраўніка дзяржавы з кіраўнікамі дэлегацыі СМЗС СНД Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў Сяргея Лебедзева, старшыню Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД, дзяржаўнай узнагародай Рэспублікі Беларусь — ордэнам Пашаны.

* * *

Пасля пасяджэння Савета міністраў замежных спраў Садружнасці Незалежных Дзяржаў кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства Уладзімір Макей пракаментаваў прынятыя рашэнні. Ён адзначыў, што абмеркаванне прайшло канструктыўна. Міністры дамовіліся далей працаваць над канцэпцыяй развіцця СНД, актуалізаваць яе і адаптаваць да сучаснасці. Таксама было прынятае рашэнне наконт работы над заявай, якую ініцыявалі Беларусь і Расія, пра недапушчальнасць размывання прынцыпу неўмяшання ў міжнародныя справы. Як растлумачыў Уладзімір Макей, размова ідзе пра тое, што зараз, знайшоўшы розныя зручныя прычыны, некаторыя геапалітычныя гульцы актыўна ўмешваюцца ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў. Напрыклад, мы бачым, як «арабская вясна» ператварылася ў «арабскую зіму». Падыход, калі стандарты і шаблоны навязваюцца іншым краінам без уліку іх спецыфікі, лічыцца непрымальным. Выканаўчы сакратар СНД Сяргей Лебедзеў адзначыў, што кіраўнікі дэлегацый дамовіліся падтрымаць гэту заяву, папрацаваць над ёй і прыняць у рабочым парадку.

Сяргей Лебедзеў таксама расказаў, што падтрымана прапанова туркменскага боку распрацаваць сярэднетэрміновую праграму супрацоўніцтва краін Садружнасці ў міжнароднай сферы. Выканкам СНД разам з дзяржавамі пачне работу над яе падрыхтоўкай. Ён анансаваў, што 12—13 красавіка пройдзе пасяджэнне Міжпарламенцкай асамблеі СНД у Пецярбургу, а 1 чэрвеня ў Душанбэ адбудзецца пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці.

Старшыня Савета міністраў замежных спраў СНД і кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Таджыкістана Сіраджыдзін Аслаў, падводзячы вынікі, адзначыў, што СНД з'яўляецца зручнай пляцоўкай для абмеркавання актуальных пытанняў і пошуку прымальных рашэнняў. Можна таксама адзначыць, што сярод шэрагу дагавораў, якія абмяркоўваліся ўчора, быў падтрыманы міжнародны маладзёжны праект «100 ідэй для СНГ», а 2021 год аб'яўлены Годам архітэктуры і горадабудаўніцтва ў СНД. Наступнае пасяджэнне міністраў замежных спраў СНД пройдзе ў верасні ў Душанбэ.

**Вераніка ПУСТАВІТ, Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Справы вясновыя

# СЯЎБЕ — ДАРОГУ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У гаспадарках краіны пачалася сяўба ранніх яравых, збожжавых і зернебабовых культур. Паводле інфармацыі Мінсельгасхарча, трэба засеяць плошчу ў 1,1 млн га.**
**Згодна з планам на Брэстчыне трэба пасеяць 136,2 тыс. га, у Віцебскай вобласці аграрыі будуць працаваць на 204,3 тыс. га, у Гомельскай засеюць 160,9 тыс. га, Гродзенскай — 184 тыс. га, Мінскай — 270,2 тыс. га, Магілёўскай — 150,3 тыс. га.**
**Сёлета плануецца сабраць 9 млн тон збожжа, 5 млн тон цукровых буракоў, 800 тысяч тон насення рапсу, 1,2 млн тон бульбы, 180 тысяч тон ільнотрасты і 629 тысяч тон агародніны.**

## БРЭСТЧЫНА

Як паведамілі ў Камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама, усе раёны вобласці прыступілі да сяўбы ранніх яравых. У лідарах Пінскі і Маларыцкі раёны, дзе пасеялі ўжо каля дзесяці працэнтаў яравых. Ненашмат адстаюць і іншыя паўднёвыя раёны. А ўсяго ў рэгіёне яравыя культуры трэба пасеяць сёлета на 420 тысячах гектараў, з іх 136 тысяч гектараў зоймуць ранніх збожжавыя і зернебабовыя.

Самы вялікі яравы клін у Баранавіцкім раёне. Але гэта і самы паўночны раён вобласці:

— У нас ужо сеюць дзве гаспадаркі, — расказаў карэспандэнту «Звязды» **першы намеснік старшыні райвыканкама Міхаіл ПАЛУЯН.** — «Уцёс» пачаў сеяць авёс, а механізатары філіяла «Зара» ААТ «Птушкафабрыка «Дружба» засеялі першыя дзясяткі гектараў ячменю.

Яравы клін у раёне займае 15 110 гектараў, — працягвае Міхаіл Мікалаевіч. — І справіцца з веснавой сяўбой трэба за дэкаду. Усё для гэтага ёсць: тэхніка, паліва, людзі. Кожны пагодны дзень выкарыстоўваем па максімуме. Паралельна вядзецца вываз арганікі, уносяцца мінеральныя ўгнаенні пад азімыя трыцікале, пшаніцу, ідзе падкормка шматгадовых траў, сенакосаў і пашы.

## ВІЦЕБШЧЫНА

Сёлета на поўначы краіны запланавалі сабраць не менш за 1,5 мільёна тон збожжавых.

Адпаведную задачу паставіў **губернатар Мікалай ШАРСНЁЎ**. Паводле інфармацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама, для дасягнення гэтага ёсць усе ўмовы.

У аблвыканкаме ўпэўненыя, што пры правільным падыходзе, выкананні ўсіх тэхналагічных умоў можна дасягнуць добрых вынікаў.

Сёлета пад сяўбу прадугледжана выкарыстанне каля 800 тысяч гектараў зямлі. І прыкладна палова — пад збожжавыя.

На сяўбе і ўборачнай звычайна адчуваецца недахоп механізатараў. Таму дапамагаюць гарадскія «шэфы», да ўдзелу ў механізаваных работах на зямлі далучаюцца таксама навучэнцы профільных аддзяленняў сельскагаспадарчых каледжаў.

## ГОМЕЛЬШЧЫНА

Першымі вывелі тэхніку на асобныя палі гаспадаркі Добрушскага, Лельчыцкага, Мазырскага і Ельскага раёнаў.

У большасці прадпрыемстваў вобласці падыходзіць да завяршэння падрыхтоўка глебы. У камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама паведамілі, што ўсяго на Гомельшчыне пад яравыя культуры адведзена 560 тысяч га, у тым ліку раннія яравыя збожжавыя і зернебабовыя будуць пасеяны на плошчы звыш 153 тысячы га.

Тэхніка ў гаспадарках вобласці зараз прыведзена ў поўную гатоўнасць. Створаны неабходны запас паліва і запчастак. Ва ўзмоцнены рэжым са штодзённым дзяжурствам пераведзены раённыя арганізацыі аграсэрвісу. Парк тэхнікі сельгаспрадпрыемстваў вобласці папоўніўся 122 новымі энерганасычанымі машынамі, якія створаць рэзервовы фонд і стануць, па сутнасці, механізаваным атрадам хуткага рэагавання.

Да масавай сяўбы аграрыі рэгіёна прыступяць на пачатку наступнага тыдня, як толькі дазволяць пагодныя ўмовы. Сяўбу плануюць правесці ў максімальна сціслыя тэрміны.

## ГРОДЗЕНШЧЫНА

Тут глеба прагрэлася да аптымальных параметраў, паведаміў **начальнік упраўлення раслінаводства абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама Сяргей СОНЧЫК**. Пасеў збожжавых пачалі ў Ваўкавыскім, Зэльвенскім, Мастоўскім, Шчучынскім і Лідскім раёнах. Апошнімі пачынаюць пасяўную кампанію ў паўночных рэгіёнах — Смаргонскім, Ашмянскім і Астравецкім. На 6 красавіка засеяна 300 га плошчы. На палях вядзецца шырокі комплекс падрыхтоўчых работ, у першую чаргу — падкормка глебы каліем. Забяспечанасць мінеральнымі ўгнаеннямі на сучасны момант складае 70 %, на працягу красавіка—мая вобласць поўнасцю закрые патрэбу ў азоце, фосфары і каліі. Рэгіён забяспечаны насеннем. Збожжавых і зернебабовых нарыхтавана 60 тысяч тон, што значна перавышае патрэбу.

У асноўным гаспадаркі справіліся з работай па падрыхтоўцы тэхнікі. У цэлым па вобласці для правядзення пасяўной будзе задзейнічана каля 10 тысяч адзінак тэхнікі. Яшчэ 400 будзе прыцягнута з іншых арганізацый. Таксама прадпрыемствы і ўстановы вобласці накіруюць на сельгаспалеткі 560 чалавек, што дазволіць поўнасцю ўкамплектаваць кадрамі пасяўную кампанію. Па словах Сяргея Сончыка, ёсць усе падставы меркаваць, што пры адпаведнай арганізацыі работы сяўбу можна правесці менш чым за два тыдні. Селета плануецца атрымаць 1,6 млн тон збожжа, гэта на 200 тыс. тон больш, чым у мінулым годзе.

## МАГІЛЁЎШЧЫНА

На раніцу ўчарашняга дня сельскагаспадарчая тэхніка працавала толькі на паўднёвых тэрыторыях Магілёўскай вобласці. У Кіраўскім раёне, напрыклад, падсявалі пад азімыя канюшыну.

— Яшчэ вельмі вільготная зямля, каб пачынаць працу, — паведаміў **першы намеснік начальніка Кіраўскага ўпраўлення райсельгасхарча Анатоль ЛАНКУЦЬ.** — Пакрыху вывозім арганіку на палі. Да сяўбы ў раёне ўсё гатова. Калі б не высокая вільготнасць, прыступілі б хоць сёння.

У Магілёўскім аблсельгасхарча паведамілі, што ўсе амаль 200 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў вобласці гатовыя да вясенне-палявых работ.

— Збожжавымі, зернебабовымі і ўсімі іншымі культурамі, якія мы высяваем, гаспадаркі забяспечаны на 100 %. Агульная плошча пасеваў складзе болей за 350 тысяч гектараў. Тэхніка гатова на 90—97 %. Зараз вядзецца апошняя падрыхтоўка. Толькі ў Глускім раёне ўзаралі 42 гектары глебы пад яравую сяўбу. Калі надвор'е не падвядзе, на наступным тыдні пачнуцца актыўныя работы, — паведаміла **начальнік аддзела аблсельгасхарча аблвыканкама Лілія ГУЛІНСКАЯ.**

## МІНШЧЫНА

Па словах **кіраўніка цэнтральнага рэгіёна Анатоля ІСАЧАНКІ**, вызначаны крыніцы па набыцці мінеральных угнаенняў, паліва, у цэлым падрыхтавана тэхніка, кадры. Вырашаны таксама пытанні па забеспячэнні насеннем збожжавых і зернебабовых.

**Старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Сяргей ЛЯЎКОВІЧ** адзначыў, што ў Мінскай вобласці сёлета плануецца пасеяць сельгаскультуры на плошчы 1 млн 205 тыс. гектараў. Насеннем яравых збожжавых і зернебабовых гаспадаркі забяспечаны амаль на 150 %. Ён таксама паведаміў, што сёлета часткова зменшацца пасевы кукурузы і цукровых буракоў. Менавіта ў тых раёнах, дзе іх ураджайнасць нізкая. Разам з тым пасевы лёну павялічваюцца.

У пасяўной будуць задзейнічаны больш за 9 тыс. трактароў, у тым ліку 1387 энерганасычаных. Практычна ўсе яны адрамантаваны.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ,**
**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
**Ірына АСТАШКЕВІЧ,**
**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ На слыху

# КАГО ЗАЛІЧАЦЬ У СПІС УТРЫМАНЦАЎ?

**Апублікаваны дакументы, якія тлумачаць, як будзе дзейнічаць Дэкрэт № 1. Пра тое, каму не давядзецца кампенсаваць стапрацэнтную аплату паслуг і як будзе фарміравацца база незанятых грамадзян, журналістам расказаў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ.**



Фота БЕЛТА.

У пастанове Савета Міністраў ад 31 сакавіка 2018 года № 239 прапісана, хто будзе адносіцца да занятых у эканоміцы. Гэта грамадзяне, якія легальна працуюць па кантрактах ці дагаворах падраду, індывідуальныя прадпрымальнікі, тыя, хто сплачвае адзіны падатак, займаецца аграэкатурызмам. У спіс уваходзяць таксама рамеснікі, адвакаты, творчыя работнікі (калі іх статус пацверджаны членствам у творчым саюзе), ваеннаслужачыя, свяшчэннаслужыцелі, фермеры. Калі чалавек вучыцца на дзённай форме ці ўваходзіць у склады нацыянальных і зборных спартыўных камандаў, ён таксама лічыцца занятым у эканоміцы.

Да ўтрыманцаў не адносяцца тыя, хто не мае работы з аб'ектыўных прычын. Напрыклад, інваліды, маці, што выхоўваюць дзіця да сямі гадоў, дзіця-інваліда да 18 гадоў, траіх і больш непаўналетніх. Не закране гэта пенсіянераў, тых, хто адбывае пакаранне ці знаходзіцца на прымусовым лячэнні. У спіс «дармаедаў» не ўвойдуць і жонкі ваеннаслужачых, якія праходзяць службу ў месцах, дзе складана ўладкавацца на працу. Андрэй Лабовіч адзначыў, што ўводзіцца таксама так званы льготны перыяд, на працягу якога да пэўнай катэгорыі грамадзян не будзе прымацца мер па спагнанні стапрацэнтнай аплаты за паслугі. Напрыклад, тыя, хто прайшоў ваенную ці альтэрнатыўную службу, на працягу наступных шасці месяцаў пасля яе заканчэння не лічацца ўтрыманцамі. Калі чалавек звольніўся, то ён не ўваходзіць у спіс незанятых грамадзян яшчэ на працягу наступнага квартала, калі ж яго скарацілі — на працягу паўгода. А тыя, хто скончыў вучобу, атрымаюць «адтэрміноўку» да канца года, у якім ім выдалі дыплом.

У пастанове ўрада таксама прапісана, як будзе весціся база ўтрыманцаў. Туды ўключаць такую інфармацыю аб грамадзяніне, як ідэнтыфікацыйны нумар, прозвішча, імя і імя па бацьку, дата нараджэння, пол, грамадзянства, даныя аб рэгістрацыі па месцы жыхарства, рэквізіты пашпарта. Уладальнікам базы будзе Міністэрства па працы і сацыяльнай абароне. Фінансавыя сродкі на яе стварэнне выдзеліць Міністэрства сувязі і інфарматызацыі. База будзе сфарміравана да 1 снежня бягучага года.

Прыблізны парадак работы камісій па каардынацыі працы па садзейнічанні занятасці насельніцтва вызначаны пастановай Савета Міністраў ад 31 сакавіка 2018 года № 240. Узначальваць камісіі будуць старшыні раённых (гарадскіх) Саветаў дэпутатаў, а ў мясцовых адміністрацыях — кіраўнік адміністрацыі раёна ў горадзе. Пасяджэнні будуць праводзіцца па меры неабходнасці, але не радзей за два разы на месяц. Камісіі зоймуцца пытаннямі працаўладкавання, інфармацыйнай работай, фарміраваннем спісаў грамадзян, якія павінны кампенсаваць поўны кошт паслуг. Больш дэталёвае палажэнне аб дзейнасці камісій даручана распрацаваць мясцовым органам на працягу месяца.

База ўтрыманцаў будзе фарміравацца раз на паўгода і карэктавацца кожны квартал.

Якія канкрэтна паслугі давядзецца аплачваць незанятым грамадзянам і як гэтыя грошы будуць спаганяцца, пакуль дакладна не вызначана. Дакумент, які ўрэгулюе гэтыя пытанні, прымуць у найбліжэйшы час.

— Мэта Дэкрэта № 1 не папаўненне дзяржаўнага бюджэту, — звярнуў увагу Андрэй Лабовіч. — Мэта закладзена ў назве — садзейнічанне занятасці. Ініцыятыва будзе ісці ад мясцовых органаў улады. А вось скарыстацца гэтай дапамогай ці не, грамадзянін ужо сам вырашае.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Па-гаспадарску

# Навесці парадак у лесе

## і зарабляць на ім



**Аднаўленне гібрыдна-селекцыйных цэнтраў, асвойванне ландшафтнага дызайну і сістэмны падход да магчымасцяў заробку ў лясной гаспадарцы ў хуткім часе адновяць галіну да непазнавальнасці. Ніводная замежная туя ці дэкаратыўная кветка, што можа расці ў Беларусі, не павінны канкурыраваць з айчыннымі праз два гады. А ўсе магчымыя землі, якія не выкарыстоўваюцца, трэба засадзіць лесам, каб праз 25 гадоў атрымаць першы ўраджай для высечкі. Так мяркуе віцэ-прэм'ер Беларусі Міхаіл РУСЫ, які ўчора прадставіў калектыву Міністэрства лясной гаспадаркі новага кіраўніка.**

— Не прайшоўшы пасаду ляснічага і дырэктара лясгаса, не будзеш ведаць душу работніка лясной гаспадаркі, — упэўнены Міхаіл Русы. — Пасада гэта найвышэйшая, адказнасць — не меншая. Віталь Дрожжа — чалавек малады, але гэта самы эфектыўны ўзрост для работы і росту.

Лясная гаспадарка — адна з асноўных і даволі добра падрыхтаваных і арганізаваных галін, якой трэба надаць новы імпульс. Адны з першасных задач спецыялісты бачаць у навядзенні парадку ў лесе і арганізацыі стабільнага заробку на гэтых матэрыялах.

— У першую чаргу трэба разбірацца з сістэмай уліку і кіраўнікамі, каб звесці да мінімуму чалавечы фактар у частцы прыняцця рашэнняў па рэалізацыі піла- і лесапрадукцыі пэўнаму пакупніку. Больш актыўна працаваць і з біржай, каб кожны выконваў сваю справу, — заўважыў **Віталь ДРОЖЖА, міністр лясной гаспадаркі Беларусі.** — Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача па навядзенні парадку ў гаспадарцы ад ляснога фонду да адміністрацыйных будынкаў. Своечасовая і якасная высадка лясных культур. Ва ўмовах адсутнасці экспарту круглай драўніны трэба нарошчваць аб'ёмы вытворчасці прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю.

Каб не ствараліся несанкцыянаваныя звалкі безгаспадарнага лесу, трэба вырашыць, што рабіць з 700—800 тыс. м³ нарыхтаваных дроў, якія не вывозяцца з лесу, перапрацоўваць іх у шчэпкі ці нешта іншае. «Пачынаецца лясная «пасяўная», і ў Год малой радзімы трэба, каб кожны пасадзіў за сябе і за кагосьці па дрэве. Гэта будзе ўнёсак у навядзенне парадку на зямлі і ўдзел у Годзе малой радзімы», — заклікаў Міхаіл Русы.

**Леанід АНФІМАЎ, старшыня камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі,** дадаў, што 1,5 млн м³ драўняных і высякальных астаткаў, якія не вывозяцца з лесу і многімі лічацца прыродным гумусам, насамрэч — пакінуты ў лесе баланс, які можна выкарыстаць у народнай гаспадарцы.

— Хоць і кажуць, што лясны рэсурс аднаўляльны, аднак можна дагаспадарыцца да таго, што пасля нас нічога не застанецца. І нашчадкі будуць ведаць пра лес па кнігах і фільмах. Таму галоўная задача — рацыянальнае, максімальна прадуманае і гаспадарлівае стаўленне да лесу, — перасцярог ён.

**Ірына СІДАРОК**

■ Страта

# Памёр Аляксандр Курловіч



**Пайшоў з жыцця двухразовы алімпійскі чэмпіён па цяжкай атлетыцы Аляксандр Курловіч, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства спорту і турызму Беларусі.**

Вядомы спартсмен памёр на 57-м годзе жыцця. Акрамя дзвюх залатых алімпійскіх узнагарод, ураджэнец Гродна чатыры разы станавіўся чэмпіёнам свету. Дванаццаць разоў Аляксандр Курловіч устанаўліваў рэкорды планеты.

Ён з'яўляўся членам выканкамаў Еўрапейскай і Міжнароднай федэрацый цяжкай атлетыкі. Узначальваў прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта ў Гродзенскай вобласці

# Разам дзеля дапамогі

**Пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі ўчора Міністэрства інфармацыі і Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа.**

Як адзначыў **намеснік міністра інфармацыі Павел ЛЁГКІ**, гэта грамадская арганізацыя нясе высакародную місію і падпісаны дакумент накіраваны на тое, каб данесці да ўсіх навіны пра яе добрыя справы. **Генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольга МЫЧКО** ўпэўнена, што пагадненне аб супрацоўніцтве будзе рэалізавана ў сумесных карысных і цікавых праектах.

Першы з іх ужо можна назваць: грамадская арганізацыя аб'яўляе творчы конкурс на самую лепшую публікацыю аб яе дзейнасці. Найлепшыя матэрыялы, у тым ліку і сацыяльную рэкламу, вызначаць у сямі намінацыях. Конкурс стартуе ў маі — месячніку Чырвонага Крыжа, а скончыцца ў верасні.

Пагадненні аб супрацоўніцтве грамадская арганізацыя раней падпісала з Міністэрствам аховы здароўя, Міністэрствам унутраных спраў і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны.

Сёння ў Беларускім таварыстве Чырвонага Крыжа, які, дарэчы, праз два гады адзначыць сваё 100-годдзе, каля 400 супрацоўнікаў і больш за 16 тысяч валанцёраў. Яны аказваюць дапамогу інвалідам, пажылым і састарэлым, хворым на ВІЧ, туберкулёз і іншыя цяжкія захворванні. Летась каля 26 тысяч беларусаў і грамадзян іншых краін атрымалі дапамогу ад Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Прыходзяць на выручку супрацоўнікі арганізацыі і падчас надзвычайных сітуацый. Сёння, напрыклад, яны працуюць на поўдні Беларусі, дзе аказваюць дапамогу мясцовым жыхарам, якія пацярпелі ад веснавой паводкі.

**Алена КРАВЕЦ.**

■ Партнёрства

# СМЕЦЦЕВАЕ ПЫТАННЕ

## У Беларусі можа з'явіцца новы завод па перапрацоўцы цвёрдых камунальных адходаў

Магчымасць яго стварэння разглядаецца бельгійскай кампаніяй RenaSci, прадстаўнікі якой на гэтым тыдні наведалі нашу краіну. Падчас візіту адбылося абмеркаванне практычных пытанняў ажыццяўлення праекта, у тым ліку звязаных з выбарам зямельнага ўчастка, падаткаабкладаннем, выплатай акцызаў, збытам выробленай і адсартаванай для перапрацоўкі прадукцыі, а таксама атрыманнем ільгот.

— З бельгійскімі партнёрамі мы дамовіліся працягваць сумесную працу па рэалізацыі гэтага праекта і ўжо вызначылі шэраг наступных крокаў. У найбліжэйшы час спецыялісты будуць займацца вызначэннем марфалагічнага складу цвёрдых камунальных адходаў, якое дазволіць ацаніць іх рэсурсны патэнцыял і вызначыць перспектыўныя кірункі яго выкарыстання, — адзначыў **начальнік аддзела па суправаджэнні інвестараў Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі Раман АЛЕЙНІКАЎ**. — Далей мы зможам весці перагаворы ўжо больш дэталёва. У бельгійскага бізнесу сапраўды ёсць вялікая цікавасць прыйсці ў Беларусь, і цяпер мы прапрацоўваем умовы, якія будуць выгадныя абодвум бакам.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

# СВЯТА, НАПОЎНЕНАЕ ЛЮБОЎЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кожны чалавек, нават самы апошні грэшнік, знаходзіць сёння надзею на спасенне, бо і ён адкуплены каштоўнай крывёю Іісуса Хрыста. Але каб успрыняць плады гэтага вялікага Адкуплення, трэба мець веру — такую, якая здольна поўнасцю змяніць наша жыццё. Для таго, хто веруе, усё магчыма, калі вера яго — шчырая, сардэчная (пар. Мк. 9:23). Гасподзь, Які ёсць «уваскрэсенне і жыццё», абяцае таму, хто веруе ў Яго, што калі ён і «памрэ, будзе жыць... кожны, хто жыве і веруе ў Мяне, не памрэ давеку» (Ін. 11:25-26).

Ад гэтага часу цемра граху і смерці, якая аддзяляе чалавека ад Бога, знішчана ўсёперамажнай сілай і благадаццю Хрыстовага Уваскрэсення. Божым Промыслам чалавеку падаравана ісцінная свабода, магчымасць адраджэння ад смерці да жыцця, магчымасць праабражэння. Праз Уваскрэсенне Хрыстова чалавек атрымаў Божы дар і сілу лячыць сваю прыроду і ўзыходзіць да богападобнай годнасці.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зараз кожны можа змяніць сваё жыццё, ідучы шляхам Евангельскім, можа, абнавіўшыся і аднавіўшы ў душы стан міру і любові — «Царства Божага», якое «ўнутры вас» (Лк. 17:21), быць усыноўленым Богу. Гасподзь заклікае нас: «Прыйдзіце, благаславёныя Айца Майго, прыміце ў спадчыну Царства, угатаванае вам ад стварэння свету» (Мф. 25:34).

Пасля Свайго Уваскрэсення Іісус Хрыстос, Подзвігазаснавальнік нашага спасення, кажа тым, хто прыйшлі да Яго магілы: «Радуйцеся!» (Мф. 28:9), святыя апосталы паўтараюць услед за Бажэственным Настаўнікам: «Заўсёды радуйцеся!», «Радуйцеся заўсёды ў Госпадзе!», таму што для верных прызначана на нябёсах найвялікшая радасць і ўзнагарода (пар. 1 Фес. 5:16; Філ. 4:4). Гасподзь абяцае, што ў жыцці вечным усе верныя Хрысту ўвойдуць «у радасць Гаспадара» свайго (Мф. 25:21).

Гэтая «радасць у Госпадзе» мае духоўную прыроду, бо падаецца благадаццю Святога Духа. Але пры гэтым мы не павінны ўтрымліваць гэты дар у сабе, скрываць яго, бо, пазнаўшы Пасхальную радасць, мы не можам не падзяліцца ёю з нашымі бліжнімі, з тымі, хто нас акружае, «радуючыся з тымі, хто радуецца» (Рым. 12:15).

Мы з вамі зноў сталі ўдзельнікамі вялікай падзеі ўсяленскага значэння! Хрысціяне вось ужо каля дзвюх тысяч гадоў у дні ні з чым не параўнальнай Пасхальнай радасці пацвярджаюць яе ісціннасць воклічам: ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

У сённяшнюю эпоху, калі імкненні многіх людзей абмежаваны імгненнымі клопатамі і турботамі, мітуснёй, калі яны часта не задумваюцца (а хтосьці і проста забывае) пра самае галоўнае — пра спасенне душы, пра добрае Прамысленне Божае, — асабліва важна асэнсоўваць гісторыю чалавецтва ў святле Уваскрэсення Хрыстовага, вучыцца ўсведамляць любоў Тварца, прамудрасць і розум Божы (пар. Рым. 11:33), які вядзе чалавецтва па шляху спасення.

Гасподзь Сваім Уваскрэсеннем даруе кожнаму, хто паверыць Яму і пойдзе ўслед за Ім, моц цялесных і духоўных сіл у служэнні Яму, Святой Царкве, Бацькаўшчыне, бліжнім і грамадству ў цэлым. Гасподзь дапамагае ўкараніць у нашых сэрцах Евангельскія каштоўнасці — любоў да Бога і бліжніх, дух міласэрнасці і міру, бо гэта — залог духоўнага перамянення свету, якое пачынаецца ў нашай душы і ў нашым сэрцы.

Уваскрэсенне Хрыстова адкрывае чалавецтву сэнс жыцця на зямлі, раскрывае тайну Божага Прамыслення праз падзеі, якія адбываюцца вакол нас, і заклікае мець цвёрды намер трымацца запаведзяў Гасподніх. Уваскрэслы Спасіцель заклікае нас вызначыць сваю жыццёвую пазіцыю і працаваць з поўнай аддачай сіл і здольнасцяў на славу Божую і дзеля спасення сваёй душы. Ідучы Евангельскім і спасіцельным шляхам, мы, натхнёныя і ўмацаваныя благадаццю Святога Духа, будзем здольнымі саграваць хрысціянскай любоўю і цяплом сваіх сэрцаў і тых, хто жыве побач з намі, хто мае патрэбу ў нашым клопаце, хто пакутуе і смуткуе, хто перажывае жыццёвыя цяжкасці і праблемы.

Царква заклікае ўсіх нас дзяліцца радасцю сённяшняга Пасхальнага свята і, шчыра падтрымліваючы адно аднаго, не толькі сёння, а ва ўсе дні нашага жыцця ўзрастаць у веры, надзеі і любові.

Напаўняючыся радасцю аб Хрысце Уваскрэслым, зноў і зноў віншую ўсіх вас са светлазарным святам Уваскрэсення Хрыстовага і ад усёй душы вітаю светаспасіцельным і радасным дабравесцем:

ХРЫСТОС УВАСКРЭС!

САПРАЎДЫ ЎВАСКРЭС ХРЫСТОС!

**ПАВЕЛ, мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі**

■ Традыцыі

# Паклікаць вясну

**Даўней казалі, што ў гэты дзень дзеўка касу не пляце, а птушка гнязда не ўе. Забаранялася гарадзіць плот, выганяць упершыню скаціну на пашу, вывозіць на поле гной ці сеяць. Па народным павер'і, да Дабравешчання ўвогуле нельга было капаць зямлю, бо яна магла загнявацца ды не ўрадзіць. А вось на Гродзеншчыне да Дабравешчання пякуць пшанічныя пірагі ў выглядзе жаўрукоў.**

Фальклорныя вячоркі арганізавалі да свята ў сельскім клубе аграгарадка Баруны, што ў Ашмянскім раёне. Памяшканне ператварылася ў сялянскую хату, упрыгожаную самабытнымі вышыўкамі, а яе гаспадыня — бабуля Алена — прымала ў госці дзятву. Разам з малымі гаспадыня замясіла цеста і напякла пшанічных жаўрукоў, якімі частаваліся дзеці і астатнія госці свята.

Супрацоўнікі клуба рупліва займаюцца адраджэннем народных свят і абрадаў. **Бабуля Алена, яна ж — загадчык сельскага клуба аграгарадка Баруны Алена АЛЬШУК,** заўважыла: «Мы хочам паказаць людзям тую культуру нашых продкаў, на якую, часам, забываемся, каб яны помнілі, як гэта рабілі нашы бабулі і дзядулі».

**Ірына СІДАРОК**

# ПРАЗ ВЫПРАБАВАННІ

**Вёсачка Сеўрукі даўно стала тэрыторыяй Гомеля. Зараз там знаходзяцца прэстыжныя катэджы заможных гараджан. А яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму ў старым драўляным доме жыла простая жанчына, інвалід з дзяцінства, якую сёння праваслаўныя вернікі называюць святой. Святая Манефа Гомельская, Марыя Скопічава, нарадзілася сто гадоў таму — першага красавіка 1918 года. У 2007 годзе, праз 23 гады пасля смерці, была кананізаваная Беларускай праваслаўнай царквой.**



У гомельскім кафедральным саборы Святых апосталаў Пятра і Паўла сёння знаходзяцца мошчы прападобнай. Такое найменне праваслаўныя хрысціяне ўжываюць да тых манахаў, якія асабліва дагадзілі Богу. Архімандрыт гомельскага Свята-Мікольскага манастыра Сава (Мажука) расказвае, што, на жаль, многа артэфактаў, якія маглі б расказаць больш пра жыццё матушкі Манефы, знікла:

— У справе збору матэрыялаў больш за ўсіх папрацавала наша прыхаджанка, прафесійны гісторык Валянціна Цімафеенка-Фернандэс, якая цяпер жыве ў ЗША. У яе было паслушанне — апытваць сведак. Шмат гадоў спатрэбілася на гэту справу. Дарэчы, калі людзі расказвалі пра матушку Манефу, у іх мяняўся твар. У іх памяці адлюстроўвалася тое святло, якое яны бачылі ў яе абліччы. А гэта быў чалавек неверагодных любові і гумару. У свядомасці звычайнага праваслаўнага верніка святасць мае пэўны пафас урачыстасці, статычнасць і строгасць. Дык вось, матушка Манефа вельмі любіла людзей і сама была вельмі жывой. Такі вобраз рушыць нашы стэрэатыпы пра святасць. Яна з гумарам ставілася да сваёй папулярнасці. Калі ў адной з гомельскіх газет была надрукавана карыкатура на яе ў манаскім адзенні, ёй гэта вельмі спадабалася. Нягледзячы на тое, што аўтар артыкула з яе здзекваўся, яна казала: «Вось, гляньце: зрабілі мяне сапраўднай ігуменняй». Яна не шукала прызнання сярод людзей. Гэта быў чалавек вялікай прастаты і душэўнай адкрытасці. Маю маці Манефа вучыла чытаць па-царкоўнаславянску. Пры тым што сама школу не заканчвала. Мама запомніла, што матушка Манефа яе частавала мятнымі цукеркамі-падушачкамі.

Будучая схіманахіня нарадзілася ў сялянскай сям'і Уладзіміра і Глікерыі Скопічавых. Даволі хутка стала зразумела, што ў дзіцяці цэрэбральны параліч і яна ніколі не зможа хадзіць. Маша перасоўвалася на руках, дапамагаючы бацькам гатаваць ежу, прыбіраць і нават праць бялізну. Пры гэтым яна заўсёды была занятая і імкнулася не заўважаць сваёй невылечнай хваробы. Каб не быць цяжарам, навучылася добра шыць.

— Многія людзі моляцца хрысціянскім святым у надзеі атрымаць палягчэнне ў смутку і хваробах, многія пры гэтым сведчаць, што іх малітвы пачуты. Аднак самі святыя часам вельмі цяжка, бясконца хварэлі, як, напрыклад, і прападобная Манефа Гомельская, — разважае выкладчык біблейска-багаслоўскіх курсаў Гомельскай епархіі БПЦ Аляксандр Ялопаў. — Іншым людзям хапае ў дзясяткі разоў меншых праблем, каб паставіць на сабе крыж і імкліва спіцца. Але Марыя расла ў асяроддзі вернікаў, хрысціян не толькі па назве. Яе з дзяцінства прывучылі думаць пра тое, што свет Божы хоць і цяжкі, але выдатны, і яна ў ім не лішні чалавек. Сваю хваробу яна ўспрымала не як праклён, а як выпрабаванне, пасланае ёй Богам, як дарунак з загадкавым, але добрым сэнсам.

Перад вайной яе пастрыглі ў манахі. Потым, калі Чонка-Макар'еўскі манастыр пад Гомелем быў спустошаны, яна на пэўны час знайшла прытулак у вёсцы Вішнёўка Цярэніцкага сельсавета. Там існавала традыцыя «перанясення свечкі». Ушанаваны абраз з малітвамі пераносілі з хаты ў хату, дзе ён павінны быў знаходзіцца ўвесь наступны год. Менавіта матушка Манефа трымала ўпрыгожаную велізарную свечку, а саму жанчыну неслі на руках з хаты ў хату. У той час жанчыны часта пыталі яе пра лёс сваіх мужоў, якія ваявалі на фронце. Яна дакладна ведала: хто загінуў, а хто вернецца жывым. І казала: маліся за яго.

У часы хрушчоўскай «адлігі» рэлігійная дзейнасць была пад строгім кантролем улад. Захаваўся цікавы дакумент, які датуецца 1958 годам.

«Са справаздачнага даклада ўпаўнаважанага Савета па справах рускай праваслаўнай царквы пры Савеце Міністраў СССР па Гомельскай вобласці Лабанава. На працягу трох апошніх гадоў святар Крыўскай царквы Рагачоўскага раёна Патоцкі Арцём прыязджаў у вёску Сеўрукі Гомельскага раёна, што за сто кіламетраў ад вёскі Крыўск, да нейкай манашкі Манефы, у хаце якой у кожны прыезд ён служыў па два дні царкоўныя службы. На гэтыя службы збіралася нямала веруючых грамадзян не толькі з гэтай вёскі, але і з суседніх вёсак. Некаторыя з гэтых багамольцаў запрашалі Патоцкага да сябе ў хату служыць рознага роду набажэнствы. Такім чынам хата Манефы была ператворана фактычна ў нелегальны малітоўны дом. Я папярэдзіў Патоцкага пра тое, што калі ён не спыніць такія царкоўныя службы, то будзе зняты з рэгістрацыі. Тады ён расказаў мне пра рэлігійную дзейнасць гэтай Манефы наступнае: гэта Манефа (манаскае імя), быўшы даўно хворая ў выніку паралізацыі ног, услявіла сябе праз іншых фанатыкаў, што яна быццам бы з'яўляецца «святой» прадказальніцай, чытае біблію і іншыя царкоўныя кнігі і нібы чуе голас божы. У выніку да яе даўно нямала ходзіць розных хворых і веруючых грамадзян, як паломнікі, якія носяць ёй сельгаспрадукты як прынашэнні і плацяць грошы за «вылячэнне».

Партыйныя службоўцы абавязаны былі рапартаваць пра пастаяннае зніжэнне цікавасці чалавека працы да веры. А такія прыклады, як матушка Манефа, відавочна псавалі ўсю справаздачнасць. Характэрна, што многія з тых, хто ў дакладах і артыкулах царкву не звалі інакш, як «рассаднік цемрашальства», употай хрысцілі сваіх дзяцей. Тым больш радавыя грамадзяне. Многія заставаліся пры матушцы Манефе надоўга, некаторыя назаўсёды, адзначае архімандрыт Сава (Мажука):

— Насамрэч гэта была абшчына людзей, пабудаваная па прынцыпе «працуй і маліся». Вакол матушкі Манефы збіраліся людзі, якія цягнуліся да яе дабрыні. Усе, хто меў з ёй стасункі, заўважалі пастаянную яе дзейнасць. Яна сама не хадзіла, але вакол яе заўсёды былі людзі, якіх яна арганізоўвала на добрыя справы. Гэта быў кругазварот жыцця. Ёсць стэрэатып, што манашкі сумныя і закрытыя, але гэта не так. Пры тым што ў гэты гурток уваходзілі людзі глыбокай малітоўнасці, вельмі ўважлівыя да свайго духоўнага жыцця. Расказвалі і пра тое, што матушка Манефа адразу ж ведала пра грахі чалавека. Пры гэтым яна паблажліва ставілася да людзей, якія памыляліся ці нават хлусілі ёй. Ці крыўдзілі, што таксама здаралася.

Урэшце па параду і з просьбай асабліва памаліцца да вясковай манашкі сталі звяртацца і святары, прычым не толькі з Гомеля, але нават з Кіева і Мінска. У многіх людзях яна літаральна запаліла полымя веры. Чалавек піў з матушкай чай, глядзеў, як яна чытае Святое Пісанне ці шые, і раптам узрушана разумеў, што, вядома ж, Бог ёсць, адзначае Аляксандр Ялопаў:

— Вядома, калі глядзіш зараз на фатаграфіі поўнай жанчыны з простым сялянскім тварам, цяжка разгледзець у ёй святую. Спытаеце: ці сапраўды Беларуская праваслаўная царква не памылілася, калі кананізавала Манефу (Скопічаву) у 2007 годзе? Між тым, калі вас самога, крый божа, напаткае цяжкая хвароба, паспрабуйце не ныць, а стаць крыніцай кахання, радасці, сіл і аптымізму для сваіх блізкіх, паспрабуйце спагадаць ім больш, чым шкадаваць сябе. Калі гэта атрымаецца — месца ў Царстве Нябесным, побач з матушкай Манефай, будзе вас чакаць.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Рэпарцёр

# МАЙСТРЫ ВУЧЫЛІ І ЧАСТАВАЛІ

## Рыхтуемся да Вялікадня

**На цэнтральную плошчу горада — Савецкую — з'ехаліся майстры з усёй вобласці — кожны са сваімі традыцыйнымі вырабамі. Таму наведвальнікам было з чаго выбіраць. Нехта спрабаваў навучыцца роспісу яек. Многія падыходзілі да майстра-ганчара. Хтосьці прыцэньваўся да кошыкаў і сувеніраў. Мне ж хацелася купіць велікодны куліч. Гэта атрымалася не адразу.**



Прызнацца, многае на кірмашы выклікала захапленне. Па-першае, майстрыхі-ткаллі. Яны не проста дэманстравалі свае вырабы, але прывезлі нават ткацкія станкі, за якімі і працавалі. Хто цікавіўся, тлумачылі, як гэта робіцца. Напрыклад, з Лідчыны прывезлі традыцыйныя белаўзорыстыя вырабы, з Ваўкавыска — двухніткоывя. Можна было палюбавацца прыгожымі посцілкамі, ручнікамі, саматканымі палавікамі. Як аказалася, абодва раёны прадстаўляюць свае элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Тут адрадзілі самабытнае майстэрства і яго развіваюць.

Майстар Яніна Ігольская заўважыла, што вялікі попыт на палавікі, нават не паспяваюць ткаць. За 1 метр прасілі 15 рублёў. Ручнікі значна даражэйшыя — 40—70 рублёў. Купляюць у асноўным на вяселле.

Непадалёку заўважаю майстар-клас па аваладанні тэхнікай «драпанкі». Метадыст Вольга Сліж з Мастоў паказала, як можна зрабіць прыгожы ўзор на ўжо пафарбаваных яйках. Быццам, і не складана — надрапаць на чырвонай шкарлупіне нешта асаблівае. Але лепш спачатку зрабіць эскіз алоўкам.

Велікодныя яйкі былі прадстаўлены ў розных тэхніках. Напрыклад, з бісеру. Такія каштавалі ад 15 да 50 рублёў.

Яшчэ звярнула ўвагу на дэкаратыўныя даволі вялікія, чорнага колеру, яйкі, інкруставаныя саломкай. Некаторыя былі ўпрыгожаны нават вышыўкай, кветкамі з тасьмы, элементамі вязання.



Кожны раён па-свойму падаў велікодныя атрыбуты. І невыпадкова, бо гэта яшчэ і конкурс. Дырэктар абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Ірына Дземянчук паведаміла, што ацэньваецца велікодны кошык, калекцыя яек, пано, паштоўка і печыва.

У выніку найлепшую калекцыю велікодных яек сабрала Марына Савіцкая з Ліды, найлепшы кошык для велікоднага стала сплялі Ірына Юшкевіч і Вольга Вайтовіч з Мастоў, самае прыгожае печыва прадставіла Ларыса Мудрацова са Слоніма, вербы зрабіла Дамініка Каваленак з Гродна, велікодныя пано і паштоўку добра аформілі Святлана Кудаш і Ірына Пекар з Ваўкавыска.

Але ж вернемся да галоўнай мэты — пакупкі велікоднага куліча. Аказалася, што зрабіць гэта не так проста. Прадстаўлялі свае кулінарныя вырабы некалькі раёнаў. І кулічы там разабралі вельмі хутка. Але ўсё ж удалося купіць прыгожы каравайчык, з кветкамі і птушкамі. Спяклі яго слонімскія каравайшчыцы ў сапраўднай печы. Такія караваі выпякалі са старажытнасці, таму традыцыя слонімскіх майстрых увайшла ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Яны славіліся выпяканнем абрадавых, у тым ліку вясельных, караваяў.

Дарэчы, на кірмашы былі прадстаўлены дзевяць носьбітаў нематэрыяльнай спадчыны Гродзеншчыны. У іх ліку — пісанка з Сапоцкіна.

У нашай краіне практыкуе 41,5 тысячы ўрачоў і амаль 126 тысяч сярэдняга медыцынскага персаналу (у 2010 годзе гэтыя лічбы складалі 33,3 тысячы і 121,8 тысячы адпаведна). А медыцынскую дапамогу аказвае 636 бальнічных і 2311 амбулаторна-паліклінічных устаноў розных формаў уласнасці. Асаблівая ўвага ў Беларусі — ахове мацярынства і дзяцінства. Пра здароўе жанчын і дзяцей клапоцяцца ўрачы 142 жаночых кансультацый, 18 радзільных дамоў, 20 дзіцячых бальніц і 45 дзіцячых паліклінік. З 2010 года колькасць акушэраў-гінеколагаў вырасла з 2503 да 2757, а ўрачоў-педыятраў сёння працуе 4087 (3654 — восем гадоў таму).

Штогод у Беларусі павялічваецца колькасць людзей, якія знаходзяць час для пастаянных заняткаў фізічнай культурай і спортам. Калі ў 2010 годзе рознымі відамі фізічнай актыўнасці займаліся 22,5 % беларусаў, то летась гэты паказчык складаў 28 %. Адметна, што сярод мужчын паказчык вырас не так значна — з 23,5 % да 26 %. А вось жанчыны далучаюцца да фізічнай культуры больш актыўна. Месца спартыўным заняткам ёсць у жыцці амаль паловы беларусаў ва ўзросце ад 16 да 29 гадоў. Але чым больш старэйшыя нашы суайчыннікі, тым менш яны ўдзяляюць увагі фізкультуры. Ва ўзросце ад 60 і больш толькі 21 % беларусаў рэгулярна трэніруюць свой арганізм.

Цікава, што летась 27,6 % нашага насельніцтва ва ўзросце больш за 16 гадоў ацэньвалі стан свайго здароўя як добры. 62,8 % лічаць яго здавальняючым. Не сакрэт, што беларусы сталі жыць даўжэй. Чаканая працягласць жыцця з 2010-га павялічылася на чатыры гады і летась яна складала 74,4 года. Прычым жанчыны жывуць у сярэднім на 10 гадоў даўжэй за мужчын: працягласць жыцця прыгожай паловы складае 79,2 года, мужчын — 69,3.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Юрыдычная клініка гатова дапамагчы

### Беспрацоўных, малазабяспечаных, шматдзетных пракансультуюць бясплатна

**З 3 красавіка Юрыдычная клініка (Секцыя кансультавання) Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» ў Мінску пачала аказваць бясплатную кансультацыйную дапамогу асобным катэгорыям грамадзян.**

Тут будуць бясплатна кансультаваць па прававых пытаннях беспрацоўных, малазабяспечаных, адзінокіх маці (бацькаў), шматдзетныя сем'і, дзяцей-сірот, інвалідаў усіх груп, удзельнікаў вайны, навучэнцаў.

Кансультантамі Секцыі з'яўляюцца студэнты 3-4 курсаў Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО», якія будуць аказваць паслугі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў, у тым ліку юрыстаў-практыкаў.

Секцыя кансультавання спецыялізуецца на грамадзянскім праве, сямейным праве, а таксама пытаннях абароны гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі. Інфармацыйна-прававая дапамога будзе заключацца ў тлумачэнні нормаў права, дачы заключэнняў на аснове фабулы справы кліента і нормаў права (кансультаванне). Але студэнты «МІТСО» не будуць прадстаўляць кліента ў судзе, таксама яны не будуць разглядаць крымінальныя справы.

Кансультаванне кліентаў будзе праводзіцца па аўторках і чацвяргах (за выключэннем тых, якія выпадаюць на выхадныя дні ў сувязі з дзяржаўнымі святамі) з 15.00 да 17.00 па адрасе: г. Мінск, вул. Казінца, 21, к. 3, аўдыторыя 216.

Прыём будзе весціся толькі па папярэднім запісе, які ажыццяўляецца па тэлефоне (8017) 279-98-90, таксама можна будзе запісацца на кансультацыю, накіраваўшы электронны ліст па адрасе: legalclinic_mitso@mail.ru.

**Святлана БУСЬКО**

■ Погляд збоку

# «ТУТ Я НЕ АДЧУВАЮ СЯБЕ ЧУЖЫНКАЙ»

## Дзяўчына-перуанка — аб стажыроўцы, быце і нацыянальных стравах

**Калі ў палату заходзіць Лі Сагіра ТЭХАДА, твары пацыентаў святлеюць. Гэтая дзяўчына з далёкай сонечнай краіны выпраменьвае цеплыню, спагаду, дабрыню. «Ну, як вы сёння спалі?» — звяртаецца да аднаго. «Вам трэба лепш есці, каб хутчэй стаць на ногі», — кажа другому. Некаму паправіць падушку, іншага накрые коўдрай, камусьці падасць вады. І абавязкова на развітанне падбадзёрыць: «Не перажывайце, усё будзе добра, вы паправіцеся».**



Фота Анатоля БАСАВА.

**Будучы медык лічыць, што ўрач павінен быць не толькі прафесіяналам сваёй справы, пастаянна вучыцца, спасцігаць новае, але і ўмець суперажываць пацыенту, быць цярплівым, выслухаць яго, супакоіць, успрымаць яго боль як уласны.**
**А дрэнны настрой, праблемы неабходна пакінуць дома.**

### НАШЧАДАК КРАІНЫ ІНКАЎ

Лі прыехала ў Беларусь з Перу, з горада Куска, які знаходзіцца ў Андах і на працягу некалькіх стагоддзяў быў сталіцай імперыі інкаў. І, вядома, славіцца сваімі археалагічнымі помнікамі.

— У цэнтры Куска — Збройная плошча ў атачэнні будынкаў са скляпеністымі галерэямі, з разнымі драўлянымі балконамі. Тут жа можна ўбачыць рэшткі сцен, узведзеных інкамі. У манастыры Святога Дамініка, які надбудаваны над руінамі храма Карыканча (храм Сонца), захавалася каменная кладка інкаў, — расказвае пра сваю радзіму дзяўчына.

Лі скончыла Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт і стажыруецца цяпер у першай Мінскай клінічнай бальніцы ў аддзяленні анкалогіі.

Спачатку дзяўчына праходзіла падрыхтоўчыя курсы, дзе спасцігала незнаёмую і складаную для яе рускую мову. Затым вучылася на ўрача-анколага. Цяпер набіраецца практычнага вопыту ва ўстанове аховы здароўя.

— У Беларусі на высокім узроўні вядзецца медыцынская падрыхтоўка спецыялістаў. У мяне былі вельмі добрыя педагогі ва ўніверсітэце. У першай клінічнай бальніцы таксама прафесіянальныя ўрачы, якія шмат чаму мяне навучылі, — дае ацэнку дзяўчына сістэме падрыхтоўкі кадраў.

— Лі Тэхада вельмі старанная стажорка, упэўнены, будзе добрым анколагам, — лічыць **урач аддзялення малой інвазійнай тэрапіі Канстанцін ШЫШКО.**

Стаць урачом па анкалагічных захворваннях Лі хацела з дзяцінства. Дзяўчына ведала аб пакутах хворых на рак не па чутках. Яшчэ школьніцай яна працавала валанцёрам у медыцынскіх установах свайго горада. «Анкалогія — гэта праблема для ўсіх краін свету. Перу не выключэнне, — канстатуе Лі Сагіра Тэхада. — Праз год я вярнуся дадому, каб дапамагаць сваім землякам змагацца з гэтай каварнай хваробай. Пакуль не ведаю, дзе буду працаваць. Магчыма, у дзяржаўнай клініцы, а можа, у прыватнай». Але гэта для Лі не важна, галоўнае, яна будзе палягчаць боль і пакуты хворых. Будучы медык лічыць, што ўрач павінен быць не толькі прафесіяналам сваёй справы, пастаянна вучыцца, спасцігаць новае, але і ўмець суперажываць пацыенту, быць цярплівым, выслухаць яго, супакоіць, успрымаць яго боль як уласны. А дрэнны настрой, праблемы неабходна пакінуць дома.

Акрамя таго, дзяўчына ў якасці валанцёра наведвае адзін са сталічных інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў. З імі ладзіць розныя гульні, малюе.

### УПЕРШЫНЮ Ў ЖЫЦЦІ ЎБАЧЫЛА СНЕГ

— Чаму менавіта прыехалі ў Беларусь набываць спецыяльнасць? — пацікавілася ў сваёй суразмоўніцы.

— Я нават не ведала, што ёсць такая краіна. Лічыла, што гэта Расія, — усміхаецца яна. — Але дапамог разабрацца сябар майго брата, які вучыўся ў Мінску. Менавіта ён расказаў, што гэта самастойная, незалежная дзяржава. І мой брат паступіў у Беларускі дзяржаўны політэхнічны ўніверсітэт. Пасля заканчэння вярнуўся ў Куска, дзе цяпер працуе інжынерам. Самае цікавае, мяне папярэджвалі перад ад'ездам у Беларусь, што з сабой трэба браць куртку, бо тут бываюць халады, мароз, снег. Але я палічыла, што цёплая куртка гэта — світар. Ужо тут, на месцы, купляла ўсё неабходнае, каб не мерзнуць, — успамінае дзяўчына.

Падчас нашай сустрэчы з Лі на вуліцы ішоў снег. На яе чорныя бліскучыя валасы лажыліся сняжынкі.

— А ў нас трыццаць градусаў цяпла, — з сумам заўважыла яна. — Упершыню ўбачыла снег, калі прыехала ў Мінск. Холадна, вядома, але я люблю, калі навокал усё бялюткае, вельмі прыгожа.

Сям'я Лі жыве ва ўласным пяціпавярховым доме: маці, брат з жонкай і двое малых дзетак. У Мінску Лі здымае кватэру. Яна сябруе з зямлячкай, таксама перуанкай, замежнымі студэнтамі: ходзяць у кіно, на выстаўкі, гуляюць па горадзе. Але самы лепшы яе сябра — сабачка Бланкіта. Гэтага белага пухнатага шчанюка Лі ўзяла ў прытулку. Бланкіта паедзе з ёй у Перу, Лі зрабіла для яе пашпарт і чып.

Як прызналася Лі, яна вельмі любіць сабак. У яе дома жывуць чатыры «браты нашы меншыя», якіх падабрала на вуліцы. «Мама мне сказала: калі прывязеш яшчэ аднаго, то будзеш з ім спаць на падлозе», — смяецца дзяўчына.

### БОРШЧ СПАДАБАЎСЯ, А САЛА — ПАКУЛЬ НЕ ПАКАШТАВАЛА

Лі сумуе па радзіме, сваіх родных і блізкіх. А яшчэ ёй не хапае свежых фруктаў, якіх у Перу мноства відаў. Яна згадвае, як з маці па дарозе ў джунглі рвалі экзатычныя плады проста з дрэў. «Яны растуць, як у вас яблыні ды грушы: у горадзе, абапал дарог», — кажа Лі Тэхада.

Што датычыцца беларускай нацыянальнай кухні, то Лі падабаюцца дранікі, бліны. А вось калі ўпершыню дзяўчына ўбачыла боршч, то вельмі здзівілася: як можна есці гэтую чырвоную мешаніну. Але ўсё ж такі рашылася пакаштаваць — аказалася смачна. А халадзец і сала да гэтага часу — ні ў рот.

Дома Лі гатуе ежу сама. Напрыклад, нацыянальную страву севічэ. Гэтая простая ў прыгатаванні ежа распаўсюдзілася па ўсёй Лацінскай Амерыцы. У залежнасці ад рэгіёна інгрэдыенты могуць мяняцца. Аднак аснову складаюць сырая рыба, замарынаваная ў соку лімона або лайма, морапрадукты: крэветкі, кальмары, васьміногі. Дадаецца сюды таксама розная зеляніна, востры перац.

За час вучобы і стажыроўкі Лі шмат дзе пабывала: у Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродне. Але найбольш ёй падабаецца Мінск з яго шырокімі вуліцамі, скверамі і паркамі. «У Беларусі жывуць добрыя і гасцінныя людзі, адкрытыя душой і сэрцам, — лічыць перуанка. — І я сябе не адчуваю тут чужынкай, аднак кліча да сябе далёкая радзіма — Перу».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

# У КІШЭНІ ГОРНАГА КНЯСТВА

## Ліхтэнштэйн мяркуе зарабляць на «крыпце»

**Ліхтэнштэйн будзе ствараць прывабнае прававое поле для блокчэйн-стартапаў. Ва ўрадзе княства распрацоўваюць новы праект закона, які будзе рэгуляваць адпаведныя бізнес-мадэлі. Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр краіны Адрыян Хаслер падчас свайго выступлення на фінансавым форуме ў Вадуцы (сталіцы Ліхтэнштэйна). Закон будзе прадстаўлены летам і павінен апісаць бізнес-мадэлі, якія базуюцца на блокчэйн-тэхналогіях, а таксама даць дзяржаўныя гарантыі для прадпрымальнікаў і спажыўцоў. Эксперты, якія працуюць над праектам, па словах Адрыяна Хаслера, павінны будуць улічыць магчымасці не толькі біткойна і асноўных крыптавалют, але і многіх іншых лічбавых плацежных інструментаў. Важнае месца ў дакуменце атрымаюць таксама ўсе галоўныя галіны, якія працуюць з блокчэйнам, сярод якіх — фінансы, нерухомасць, транспарт, аўтарскія правы, бяспека. «Ліхтэнштэйн павінен стаць адным з піянераў комплекснага падыходу да рэгулявання лічбавай тэхналогіі», — адзначыў кіраўнік урада. Навошта заможнае горнае княства пераключылася на «крыпту»?**






### ПАМІЖ АЎСТРЫЯЙ І ШВЕЙЦАРЫЯЙ

Тэрыторыя Ліхтэнштэйна з 15 года да н. э. уваходзіла ў рымскую правінцыю Рэцыя. Паводле падання, у 300 годзе святы Лука хрысціў жыхароў гэтага раёна. Франкі ўварваліся ў краіну ў 536-м. Пазней, пры Карле Вялікім, з пасады губернатара былі адстаўлены біскуп, і на гэтае месца пачалі прызначаць свецкіх кіраўнікоў. Раён знаходзіўся пад уладай Каралінгаў да 911 года, калі Усходне-Франкскае каралеўства распалася на вялікія і малыя герцагствы. У межах герцагства Швабы на тэрыторыі цяперашняга Ліхтэнштэйна знаходзіліся феадальныя ўладанні Шэленберг і Вадуц, якія пасля ўвайшлі у склад Свяшчэннай Рымскай імперыі. У 1507 годзе імператар Максіміліян даў Вадуцу асаблівыя правы і прывілеі, уключаючы суверэнітэт і збор падаткаў.

**Гэта краіна з нізкімі падаткамі, дзе ўрад вельмі лаяльна ставіцца да замежных кампаній. Каб зарэгістравацца ў дзяржаве і не плаціць падаткі, кожная кампанія павінна ўзяць у долю каго-небудзь з мясцовых жыхароў.**

Род Ліхтэнштэйнаў вельмі хацеў атрымаць месца ў рэйхстагу Свяшчэннай Рымскай імперыі. Для гэтага ён павінен быў валодаць землямі, сюзерэнам якіх быў бы непасрэдна імператар. Дзеля гэтага Ханс-Адам I набыў у збяднелых уладальнікаў Хоэнемса два маленечкія феоды на мяжы са Швейцарыяй — Шэленберг (у 1699-м) і Вадуц (у 1712-м). У гэтай тэрыторыі быў неабходны прававы статус. У 1719 годзе імператар прызнаў кіраўніка сямейства, Антона Фларыяна, князем суверэннай годнасці. Такім чынам паміж Аўстрыяй і Швейцарыяй на правым беразе ракі Рэйн з'явілася невялічкае княства Ліхтэнштэйн. З 1815 да 1866 года яно ўваходзіла ў склад Германскага саюза, прычым ў 1860-м прадстаўнікі сямейства Ліхтэнштэйн сталі спадчыннымі членамі верхняй палаты аўстрыйскага парламента, а ў 1866 годзе ў выніку распаду Германскага саюза, пры Ёгане II, княства набыло поўную незалежнасць. У аўстра-прускай вайне 1866 года Ліхтэнштэйн выступаў у якасці саюзніка Аўстрыі, потым меў цесныя сувязі з Аўстра-Венгрыяй.

Пасля Першай сусветнай вайны княства скасавала дамову з Аўстрыяй і пераарыентавалася на Швейцарыю: у 1921 годзе было падпісана пагадненне аб гандлі і паштовай службе, у 1924-м — заключаны мытны саюз. З тых часоў валютай горнага княства з'яўляецца швейцарскі франк. З 1919 года Швейцарыя прадстаўляе дыпламатычныя і консульскія інтарэсы Ліхтэнштэйна за мяжой. Падчас Другой



сусветнай вайны княства прытрымлівалася нейтралітэту. У 1990 годзе Ліхтэнштэйн уступіў у ААН, у 1991-м — у Еўрапейскую асацыяцыю свабоднага гандлю, напрыканцы 2011-га — у Шэнгенскую зону.

### БЕЗ ПЛАТОЎ

Княства плошчай усяго 157 квадратных кіламетраў лічыцца адной з самых маленькіх еўрапейскіх дзяржаў. Колькасць жыхароў складае каля 40 тысяч чалавек (напрыклад, столькі цяпер насельніцтва ў Калінкавічах). Дзве трэці насельніцтва княства — карэнныя ліхтэнштэйнцы, а астатнія — імігранты з Германіі, Аўстрыі, Швейцарыі і нават Турцыі. Ліхтэнштэйн настолькі маленькі, што тут няма аэрапорта, сюды можна дабрацца толькі на цягніку. Нягледзячы на свае памеры, княства багатае на раскошныя віды хрыбтоў і гор, альпійскіх лугоў і палёў. Заціснутая, быццам у цісках, паміж Аўстрыяй і Швейцарыяй, маленечкая дзяржава змагла захаваць уласнае «я», спрытна балансуючы на мяжы паміж утульнай вёсачкай і багатым княствам.

Гэта краіна з нізкімі падаткамі, дзе ўрад вельмі лаяльна ставіцца да замежных кампаній. Каб зарэгістравацца ў дзяржаве і не плаціць падаткі, кожная кампанія павінна ўзяць у долю каго-небудзь з мясцовых жыхароў. Паводле статыстыкі, сёння кожны ліхтэнштэйнец атрымлівае даход ад двух кампаньёнаў (паводле статыстыкі, звыш 75 тысяч міжнародных канцэрнаў і замежных кампаній зарэгістраваны на тэрыторыі Ліхтэнштэйна), таму жывуць яны выключна ў сваё задавальненне і практычна без лішніх клопатаў. Тут не прынята выхваляцца сваім багаццем, у краіне няма злачыннасці — няма і... платоў.

### МАРКІ І ТУРЫЗМ

Ліхтэнштэйн — квітнеючая індустрыяльная краіна з развітым сектарам фінансавых паслуг і высокім узроўнем жыцця (па аб'ёме ВУП у разліку на душу насельніцтва княства — бясспрэчны сусветны лідар). Краіна бедная карыснымі выкапнямі. Здабываюцца толькі вапняк для будаўнічых мэт, а таксама белыя гліны і алебастр для вырабу ганчарных вырабаў і керамікі. Сярод вядучых галін эканомікі — апрацоўчая прамысловасць, а таксама машына- і дакладнае прыборабудаванне, оптыка, вытворчасць вакуумнай тэхнікі, электронных сістэм, мікрапрацэсараў. Прамысловасць амаль цалкам сарыентавана на экспарт. Значнае месца займаюць харчовая (у прыватнасці вытворчасць кансерваў і вінаў), тэкстыльная, керамічная і фармацэўтычная прамысловасці.

З развіццём рэальнага сектара і ростам прадпрымальніцкай дзейнасці ўласныя працоўныя рэсурсы Ліхтэнштэйна перасталі задавальняць попыт на працоўную сілу. У розных сферах эканомікі занятыя прыкладна 32,4 тыс. чалавек, пры гэтым больш за трэць з іх (12,9 тыс.) штодня прыязджаюць на работу з Аўстрыі, Швейцарыі і Германіі. Больш за ўсё працаздольнага насельніцтва занята ў сферы паслуг, каля 40 % задзейнічана ў прамысловым сектары і менш за 2 % працуюць у сельскай гаспадарцы.

Эканамічны росквіт княства забяспечваецца тым, што яно выступае ў ролі фінансавага і дзелавога цэнтра міжнароднага значэння. Значная частка даходу прыходзіцца на продаж паштовых марак, якія цэняцца філатэлістамі ўсяго свету. Досыць вялікі ўклад у развіццё эканомікі прыносіць сфера турызму. Дзякуючы асаблівасцям кліматычнай зоны і рэльефу ў краіне створаны максімальна камфортныя ўмовы для развіцця гарналыжных курортаў, якія цяпер карыстаюцца неверагоднай папулярнасцю. Між тым, як паведаміла брытанскае выданне The Telegraph са спасылкай на даныя Сусветнай турысцкай арганізацыі ААН (UNWTO), Ліхтэнштэйн з'яўляецца найменш наведвальнай турыстамі еўрапейскай краінай. Летась тут пабывала ўсяго 77 тысяч замежных падарожнікаў, што на восем тысяч больш, чым годам раней. Праўда, калі суаднесці колькасць турыстаў з колькасцю насельніцтва княства, ацэнку The Telegraph можна лічыць не зусім аб'ектыўнай.

### ХАЛОДНЫЯ КАШАЛЬКІ

Улады княства дэкларуюць, што актыўна зацікаўлены ў стварэнні краіне іміджу «законнага фінансавага цэнтра з пашыраным рэгуляваннем віртуальных валют і звязаных з імі бізнес-мадэляў». Ліхтэнштэйн уваходзіць у Еўрапейскую эканамічную зону, але не ў Еўрасаюз. Важна, што фінансавыя ўстановы, зарэгістраваныя тут, уключаючы і тыя, што працуюць з крыптавалютамі і блокчэйнам, могуць абысці многія складаныя патрабаванні ЕС, працягваючы весці дзейнасць па ўсім кантыненце. Банкі Ліхтэнштэйна ажыццяўляюць інвестыцыі ў крыптавалюты ад імя сваіх кліентаў і нават прапануюць кансультацыі па ICO (Initial coin offering — «першасная прапанова манет» — форма прыцягнення інвестыцый у выглядзе продажу фундатарам фіксаванай колькасці новых адзінак крыптавалют), у той час як фінансавы сектар Еўропы ў абсалютнай большасці выпадкаў пазбягае лічбавых валют.

Напрыклад, прафесійныя інвестары і фінансавыя пасярэднікі могуць адзін раз у дзень праз платформу банка Frik інвеставаць у лічбавыя валюты: біткойн, біткэш, эфір, рыпл і лайткойн. Для абароны ад хакераў і зладзеяў гэтая банкаўская ўстанова трымае крыптавалюты ў так званых кашальках халоднага захоўвання. Яны фізічна аддзеленыя ад інтэрнэту і не могуць быць узламаныя звонку, абяцае фінансавая ўстанова. Дзякуючы сваёй прапанове банк імкнецца ўкараніць крыптахаўсу, па меншай меры, на тым жа ўзроўні якасці, што і традыцыйны банкінг. І гэта яшчэ адзін крок у развіцці крыптасістэм у княстве.

На лічбавыя валюты звярнуў увагу адзін з найбагацейшых манаршых дамоў у свеце. Наследны князь Ліхтэнштэйна Алаіз Філіп Марыя заявіў, што біткойн і іншыя крыптавалюты могуць стаць адным з інструментаў аднаўлення багацця яго сям'і, паведамляе CNBC. Ён згадаў пра тое, што збіраецца перавесці частку актываў сям'і ў лічбавыя токены. «Што датычыцца новай лічбавай эканомікі, то яе трэба лепей вывучыць у будучыні», — адзначыў Алаіз. Законны кіраўнік княства — Ханс-Адам II, аднак з 15 жніўня 2004 года абавязкі па паўсядзённым кіраванні дзяржавай выконвае менавіта наследны князь Алаіз, з'яўляючыся рэгентам. Пасля Другой сусветнай вайны сям'я была вымушана прадаць сваю калекцыю твораў мастацтва, аднак, па словах князя, большая частка яе ўжо аднаўлена, таму род шукае новыя віды актываў для інвестыцый. Алаіз дадаў, што хоць крыптавалюта пакуль застаецца «вельмі рызыкоўнай», тэхналогія, якая ляжыць у яе аснове, можа быць карысная для аптымізацыі адміністрацыйных працэсаў у Ліхтэнштэйне. «Блокчэйн зменіць вельмі многае, ён нават можа дапамагчы больш эфектыўна кіраваць нашым княствам», — дадаў наследны князь.

Але галоўнае не ў тым, што капітал князёў налічвае $5 млрд, а ў тым, што, як і ў суседняй Швейцарыі, у Ліхтэнштэйне ўпраўляць з фінансамі ўмеюць, не кажучы пра тое, што сам кронпрынц вельмі спрактыкаваўся за сваю кар'еру ў маёмасных пытаннях. Алаіз дае крыптавалютнай супольнасці зразумець, што княства — самае адпаведнае месца для іх бізнесу. І гэта працуе. Зараз штомесячныя сустрэчы па блокчэйне ў Вадуцы прыцягваюць сотні зацікаўленых ад зусім новых крыпта-стартапаў — нядрэнна для краіны памерам Ліхтэнштэйна. Але, падобна, прыцягненне бізнесаў, заснаваных на крыптавалютах і блокчэйне, — толькі частка маштабных фінансавых планаў гэтай дзяржавы. Так што з кішэняй у горнага княства ўсё ў парадку.

**Захар БУРАК.**



---

УНП 700049607

**Годовой отчет открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3» за 2017 год**

Адрес: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23. Тел./факс 28-41-00.
Генеральный директор: Тимофеев Григорий Семенович
Главный бухгалтер: Емельянова Екатерина Адамовна

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС**

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 г. | На 31 декабря 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 30 483 | 30 267 |
| Нематериальные активы | 120 | 12 | 44 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: | | | - |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 55 | 9 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 196 | 234 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 123 | 126 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **30 869** | **30 680** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 18 920 | 8 469 |
| В том числе: | | | |
| материалы | 211 | 9 983 | 5 598 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 8 021 | 2 265 |
| готовая продукция и товары | 214 | 916 | 606 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 589 | 572 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 2 010 | 1 110 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 18 169 | 13 946 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 90 | 98 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 5 065 | 3 690 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **44 843** | **27 885** |
| **БАЛАНС** | **300** | **75 712** | **58 565** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2017 г. | На 31 декабря 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 11 318 | 11 318 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 453 | 453 |
| Добавочный капитал | 450 | 19 518 | 17 289 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 3 497 | 2 683 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **34 786** | **31 743** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | - |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 2 792 | 1 795 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | 2 095 | 3 779 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **4 887** | **5 574** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | - | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 2 484 | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 33 010 | 20 613 |
| В том числе: | | 13 075 | - |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | | 8 063 |
| по авансам полученным | 632 | 14 793 | 8 051 |
| по налогам и сборам | 633 | 747 | 1 053 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 601 | 339 |
| по оплате труда | 635 | 1 598 | 1 076 |
| по лизинговым платежам | 636 | 1 940 | 1 267 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 4 | - |
| прочим кредиторам | 638 | 252 | 764 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 545 | 635 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **36 039** | **21 248** |
| **БАЛАНС** | **700** | **75 712** | **58 565** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 г. | За январь – декабрь 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 115 329 | 84 670 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (108 759) | (73 710) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 6 570 | 10 960 |
| Управленческие расходы | 040 | (6 595) | (7 457) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | (25) | 3 503 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 10 559 | 28 058 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 11 964 | 29 963 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | (1 430) | 1 598 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 737 | 541 |
| В том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 18 | 13 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 44 | 136 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 675 | 392 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (2) | (51) |
| В том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (2) | (51) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 4 388 | 7 131 |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 4 388 | 7 131 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (3 654) | (8 607) |
| В том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (207) | (111) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (2 932) | (8 123) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (515) | (373) |

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 г. | За январь – декабрь 2016 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130) | 140 | 1 469 | (986) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 39 | 612 |
| Налог на прибыль | 160 | (243) | (496) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | | - |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | (204) | 116 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 2 270 | 4 929 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 2 066 | 5 045 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | 0,12 | 0,85 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

| **4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %):** | 0 |
|---|---|

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| республиканская | | |
| коммунальная, всего: | 0 | 0 |
| в том числе: | х | х |
| областная | | |
| районная | | |
| городская | | |

**5–6. Информация о дивидендах и акциях**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 1477 | 1478 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 3 | 3 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 1474 | 1475 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 2 | 2 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 158,08 | 1195,92 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | | |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,124000 | 0,938300 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | | 0,938300 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа ___ | рублей | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа ___ | рублей | | |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | за отчетный период | Х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 30.03.2018 | Х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | 22.04.2018 | Х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 27,29 | 25,03 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | | |

| **8. Среднесписочная численность работающих** | человек | 1203 | 1085 |
|---|---|---|---|

**9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета):**

строительство и капитальный ремонт автомобильных дорог — 80 % в выручке от реализации продукции (товаров, работ, услуг).

**10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год:**

30 марта 2018 г.

**13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета).**

ОАО "ДСТ № 3" руководствуется Сводом правил корпоративного поведения (протокол Наблюдательного совета № 102 от 05.08.2008 г.), Регламентом работы с реестром владельцев ценных бумаг (протокол собрания акционеров № 54 от 14.09.2009), Положением о дивидендной политике (протокол собрания акционеров № 83 от 01.07.2015), Положением о порядке учета аффилированных лиц и согласовании сделок, в совершении которых имеется заинтересованность аффилированных лиц (протокол Наблюдательного совета № 101 от 25.07.2008 г.).

**14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет:**

www.dst3.by

Аудиторское заключение от 06.03.2018 г. б/н составлено аудитором — индивидуальным предпринимателем Татьяной Алексеевной Королевич (квалификационный аттестат аудитора № 0001053 от 29.08.2003 выдан Министерством финансов Республики Беларусь на основании приказа № 1932): «Годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 3» по состоянию на 31 декабря 2017 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь»

---

**Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белкотлоочистка» (г. Минск, ул. Аранская, 22А) за 2017 г.**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 31 ДЕКАБРЯ 2017 г.**

УНП 100071353 **(тыс. руб.)**

| Наименование показателя | Код строки | На 31.12.2017 года | На 31.12.2016 года |
|---|---|---|---|
| АКТИВ | | | |
| 1.Внеоборотные активы | 190 | 1190 | 1079 |
| 2. Оборотные активы | 290 | 1251 | 1589 |
| БАЛАНС | 300 | 2441 | 2668 |
| ПАССИВ | | | |
| 3.Капитал и резервы | 490 | 1388 | 1236 |
| 4.Обязательства | 590,690 | 1053 | 1432 |
| БАЛАНС | 700 | 2441 | 2668 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2017 г.**

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| Выручка от реализации работ, услуг | 010 | 5540 |
| Себестоимость работ, услуг | 020 | (3346) |
| Управленческие расходы | 040 | (2194) |
| Прибыль от реализации работ, услуг | 060 | 294 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 206 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 140 | (12) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 248 |
| Налог на прибыль и прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли | 160, 190 | (56) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 192 |

**Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателей | Единица измерения | За 2017 год |
|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в отчетном периоде (включая налоги) | тыс. руб. | 38,3 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,5944 |

Исполнительный директор М. М. Чикилев

Главный бухгалтер С. В. Александрович

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО "СПЕЦАВТОМАТИКА"**

| Предмет торгов | Начальная цена | Размер задатка |
|---|---|---|
| **Лот №1.** Изолированное помещение (инв. № 110/D-2776837) – трехкомнатная квартира, пл. 77,9 кв. м, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Барановичи ул. Домейко, д. 26, кв. 45 | **84 510,34 руб.** | **1560,00 руб.** |

| | |
|---|---|
| **Условия продажи** | Без условий |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки" |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО "БПС-Сбербанк" Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 10 мая 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 8 мая 2018г. до 17.00**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| № лота | Адрес участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Наличие ограничений в использовании | Начальная цена, руб. | Сумма подлежащая возмещению организатору аукциона на его проведение, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дата, время, место проведения аукциона | | | | **8 мая 2018 г. в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина,25, 4 этаж, малый зал)** | | |
| 1 | **Яревский сельисполком** Витебская обл., Поставский район, д. Задевье, ул. Озерная, д.1А | 0,1977 | 224085304601000025 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема) оз. Задевское | 5 200.00 | 1627,52 |
| Извещение о проведении повторного аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов | | | | | | |
| | Дата, время, место проведения аукциона | 24 апреля 2018 г. в 10.00 в здании Поставского райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 4 этаж, малый зал) | | | | |
| 2 | **Воропаевский сельисполком** Витебская обл., Поставский район, д. Макарщина, ул. Набережная, д. 6А | 0,2321 | 224085409101000046 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема) — оз. Белое и в охранных зонах электрических сетей, напряжением до 1000 В | 3 000.00 | 1989,18 |
| 3 | **Воропаевский сельисполком** Витебская обл., Поставский район, д. Макарщина, ул. Набережная, д. 6Б | 0,2218 | 224085409101000047 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема) — оз. Белое и в охранных зонах электрических сетей, напряжением до 1000 В | 3 000.00 | 1886,16 |
| 4 | **Волковский сельисполком** Витебская обл., Поставский район, д. Кривое-2, ул. Центральная, д. 7А | 0,1762 | 224080809601000035 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема) — оз.Кривое и в охранных зонах электрических сетей, напряжением до 1000 В | 2 000.00 | 2118,35 |
| 5 | **Камайский сельисполком** Витебская область, Поставский район, д. Петровщина, ул. Центральная, д. 5 | 0,1802 | 224081829501000006 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема) река Мяделка | 1 500.00 | 1927,64 |

| | |
|---|---|
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона** | - в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с их изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формирования земельного участка, в т. ч. государственной регистрации;<br>- в течение двух месяцев со дня утверждения протокола аукциона в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений прав на земельный участок;<br>- получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>- приступить к занятию земельного участка в течение года со дня государственной регистрации земельного участка, возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство). |
| **Порядок осмотра на местности земельного участка** | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе.<br>Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб.11 |
| **Перечень необходимых документов, представляемых участниками аукциона до его начала** | - заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>- квитанцию об уплате задатка;<br>- ксерокопии стр. 25,31,32,33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений** | г. Поставы, пл.Ленина, 25,здание Поставского райисполкома,1-й этаж, каб. 11 в рабочие дни с 8.00 до 17.00 **со дня публикации извещения по 2 мая 2018 г**. включительно. **Прием заявлений по повторному аукциону проводится со дня публикации извещения по 18 апреля 2018 г. включительно** г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11 |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения** | 10 % от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет сельисполкома.<br>Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе |
| **Адрес и номер контактного телефона комиссии** | г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб.11, в рабочие дни — с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, телефоны: 8 (02155) 4 31 80, 4 11 32 |

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Торгтехника», г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корп. 1 | | |
| **Предмет аукциона. Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Московская, д. 28** | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** |
| Здание производственной мастерской | Здание неустановленного назначения | 61,3 кв. м | 612/С-4315 |
| Здание металлического склада | Здание металлического склада | 25 кв. м | 612/С-2806 |
| **Сведения о земельном участке** | Предмет аукциона расположен на земельном участке общ. пл. 0,0382 га, предоставленным на праве постоянного пользования для размещения производственного объекта по обслуживанию и ремонту оборудования на предприятиях торговли и общественного питания города, с установленными ограничениями (обременениями): охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0069 га, охранная зона тепловых сетей, площадь 0,0032 га | | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **8 160 долларов США** (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на момент оформления сделки купли-продажи). **Снижена на 20 %** | | |
| **Задаток 10 %** по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.03.2018 | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.04.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **18.04.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42.<br>Email: auction@cpo.by** | | |

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

# ОАО «БНБ-БАНК»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2018 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 10 921 | 21 531 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 5 | 38 194 | 18 352 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6 | 38 570 | 15 657 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 7 | 56 738 | 62 610 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 8 | 300 795 | 258 766 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 9 | 204 | 274 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 10 | 80 | 80 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 11 | 25 166 | 19 258 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 12 | 3 349 | 1 070 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 13 | 7 067 | 7 022 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **481 084** | **404 620** |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | 14 | 67 964 | 84 768 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 15 | 325 631 | 247 591 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 16 | 21 793 | 17 829 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 9 | 83 | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 17 | 2 137 | 1 464 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **417 608** | **351 652** |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 18 | 11 075 | 11 075 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 19 | 6 400 | 6 400 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 20 | 11 243 | 9 835 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 21 | 34 758 | 25 658 |
| **30** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **63 476** | **52 968** |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **481 084** | **404 620** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2017 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 38 658 | 41 276 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 19 406 | 20 112 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 22 | 19 252 | 21 164 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 10 213 | 8 861 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 3 754 | 2 591 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 23 | 6 459 | 6 270 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 24 | (48) | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 25 | 9 626 | 10 274 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 26 | (517) | (3 101) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 27 | 2 536 | 14 169 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 28 | 2 340 | 1 714 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 29 | 21 508 | 17 281 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 30 | 1 455 | 1 144 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 11 613 | 3 727 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 31 | 1 574 | 573 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 10 039 | 3 154 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 18 | 0,0036 | 0,0011 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА за 2017 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 1 января 2016 г. | 3011 | 11 075 | - | 6 368 | 22 516 | 9 297 | 49 256 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | | | 32 | 3 142 | 538 | 3 712 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 3 154 | 558 | 3 712 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | | x | - | | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 2.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 2.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | | - | 32 | (12) | (20) | - |
| 2.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 1 января 2017 г. | 3013 | 11 075 | - | 6 400 | 25 658 | 9 835 | 52 968 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 1 января 2017 г. | 3011 | 11 075 | - | 6 400 | 25 658 | 9 835 | 52 968 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | | - | | 9 100 | 1 408 | 10 508 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 10 039 | 1 537 | 11 576 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | | x | - | | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (997) | x | (997) |
| 5.6 | операции с выкупленными акциями собственной эмиссии | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | x | x | - | - | x | - |
| 5.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | | - | - | 58 | (58) | - |
| 5.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | | (71) | (71) |
| 6 | Остаток на 1 января 2018 г. | 3013 | 11 075 | - | 6 400 | 34 758 | 11 243 | 63 476 |

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2017 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2017 год | 2016 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | 21 | 10 039 | 3 154 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | 20 | 1 537 | 558 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств, доходных вложений в материальные активы, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | | 1 526 | 487 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | 11 | 71 |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | ИТОГО совокупный доход | 30121 | | 11 576 | 3 712 |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2017 год

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2017 г. | 2016 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ | | | | |
